# Вызначаны самы турыстычны ўніверсітэт

Першы дзень злёту адзначыўся пачаткам конкурснай праграмы — удзельнікі змагаліся за 1-е месца ў конкурсе "Спяём, сябры". Камандам трэба было выканаць 2 песні — адну на турыстычную тэму, другую — на патрыятычную. У гэтым відзе праграмы суддзі ацэньвалі ўзровень выканальніцкага майстэрства, якасць музычнага суправаджэння, артыстычнасць і аўтарскую арыгінальнасць слоў і музыкі. Перамогу ў конкурсе атрымала каманда Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Другі дзень злёту быў насычаны спартыўнай праграмай — адбыліся спаборніцтвы па спартыўным арыентаванні, па тэхніцы пешаходнага турызму і тэхніцы воднага турызму. У спаборніцтвах па спартыўным арыентаванні ўдзельнікі пры дапамозе карты і компаса за мінімальны час павінны былі сабраць у пэўнай паслядоўнасці ўсе кантрольныя пункты, размешчаныя ў лесе. У спаборніцтвах па тэхніцы пешаходнага турызму каманды змагаліся ва ўменнях хутка і правільна пераадольваць розныя пераправы па вяроўках, выкарыстоўваючы альпінісцкі рыштунак, забяспечваючы адно аднаго страхоўкай і суправаджэннем. У спаборніцтвах па тэхніцы воднага турызму ўдзельнікі паказвалі тэхніку валодання турыстычнымі суднамі (двухмесныя байдаркі) пры праходжанні штучных перашкод — варот. Абсалютным пераможцам спартыўнай праграмы суботняга дня стаў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры. Годную канкурэнцыю прадэманстравалі таксама Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт, Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт і інш.

У другі дзень злёту таксама працягнулася конкурсная праграма: каманды прынялі ўдзел у конкурсе "Прадстаўленне каманды" і конкурсе турыстычных газет "Будні злёту". "Прадстаўленне каманды", мабыць, традыцыйна з'яўляецца самым цікавым і відовішчным з усіх конкурсных відаў. Гэта той конкурс, у якім фантазія і крэатыўнасць удзельнікаў праяўляюцца ў поўнай меры. Каманды прадстаўлялі сваю ўстанову адукацыі, расказвалі пра інтарэсы і захапленні ўдзельнікаў каманды. Суддзі ацэньвалі інфарматыўнасць, турыстычную тэматыку, арыгінальнасць, артыстычнасць, маляўнічасць афармлення выступлення і музычнае суправаджэнне. З мінімальнай перавагай перамогу ў гэтым конкурсе атрымаў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. У конкурсе турыстычных газет "Будні злёту" каманды ў рэжыме рэальнага часу і без дамашніх нарыхтовак павінны былі выпусціць газету, якая адлюстроўвае жыццё злёту. Ацэньваліся інфарматыўнасць, рознабаковасць асвятлення жыцця злёту, разнастайнасць газетных жанраў, мастацкае афармленне, акуратнасць і пісьменнасць тэксту. Перамогу ў конкурсе атрымаў Віцебскі дзяржаўны ордэна Дружбы народаў медыцынскі ўніверсітэт.

Заключным відам спартыўнай праграмы сталі спаборніцтвы па тэхніцы веласіпеднага турызму, дзе ўдзельнікі пераадольвалі дыстанцыю, якая ўяўляла сабой дынамічную паласу перашкод з паслядоўным пераадоленнем этапаў велатурысцкай тэхнікі (фігурнае ваджэнне, пераадоленне перасечанай мясцовасці з натуральнымі і штучнымі перашкодамі). Пераможцам спаборніцтваў па тэхніцы веласіпеднага турызму стаў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры.

На працягу ўсяго злёту праходзіў конкурс "Турысцкія навыкі і побыт". Два разы на дзень суддзі ацэньвалі чысціню і парадак лагераў каманд, правільнасць захоўвання прадуктаў, рыштунку, рэчаў, стан кухні, захаванне прыродаахоўных і супрацьпажарных норм, правіл паводзін на злёце і многае іншае. Пераможцамі сталі каманды Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў і Віцебскага дзяржаўнага ордэна Дружбы народаў медыцынскага ўніверсітэта.

У заключны дзень прайшла ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў і прызёраў злёту. 3-е месца ў агульным заліку заняла каманда Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, 2-е месца заваявала каманда Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, а званне самага турыстычнага ўніверсітэта краіны заваявала каманда Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры. Свята спартыўнага турызму атрымалася! Мора станоўчых эмоцый, новыя знаёмствы, вострая спартыўная барацьба і добры настрой яшчэ надоўга застануцца ў сэрцах удзельнікаў злёту!

**Вадзім ЕРМАНОК,**
**метадыст Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства.**
**Фота аўтара.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ